# ИСТОРИЯ РЕЛИГИЙ И МЕЖКОНФЕССИОНАЛЬНЫХ ОТНОШЕНИЙ

## Пратакольная дакументацыя кансісторый хрысціянскіх веравызнанняў у беларускіх губернях (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Аўтарам разглядаецца арганізацыя пратакаліравання дзейнасці кансісторый хрысціянскіх канфесій у беларускіх губернях у канцы XVIII – пачатку XX ст. У нарматыўным рэгуляванні афармлення пратаколаў і журналаў пасяджэнняў кансісторый і справаводства па іх вылучаецца два агульных этапа, звязаных з увядзеннем Статута духоўных кансісторый. У тэзісах называюцца ўласцівасці структуры і мовы названых дакументаў, адзначаецца іх інфармацыйны патэнцыял для шырокага кола даследчыкаў.*

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура хрысціянскіх канфесій на далучаных у канцы XVIII ст. да Расійскай імперыі тэрыторыях была сфарміравана ў першай трэці XIX ст.: праваслаўныя цэрквы ўваходзілі ў склад Магілёўскай, Полацкай і Мінскай епархій, рымска-каталіцкія – Магілёўскай і Мінскай, уніяцкія – Беларускай і Полацкай. У іх былі ўтвораны органы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда – кансісторыі, матэрыялы дзейнасці якіх з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для шматаспектнага вывучэння дзейнасці канфесій і побыту насельніцтва разглядаемых тэрыторый. У тым ліку падсістэма пратакольнай дакументацыі, якая адносіцца да сістэмы агульнай справаводнай дакументацыі ўстаноў, займае значнае месца, таму што дазваляе прасачыць працэс прыняцця рашэнняў і адлюстроўвае дзейнасць установы.

Кансісторыі ўтвараліся па ўказах імператара і, адпаведна падпарадкаванню органам дзяржаўнай улады, павінны былі карыстацца ва ўласным справаводстве нарматыўнымі прававымі актамі Расійскай імперыі. Падчас выпрацоўкі лакальных дакументаў з канца XVIII ст. установы кіраваліся Генеральным рэгламентам 1720 г. У 1810 г. Полацкай уніяцкай кансісторыі было прадпісана ім карыстацца, пры чым акцэнтавалася ўвага на пунктах 5 і 29 для арганізацыі працы сакратара, п. 31 – пратакаліста і п. 34 – рэгістратара [8, арк. 11]. У 1841 г. прыняты Статут духоўных кансісторый, які ў агульных палажэннях быў распаўсюджаны на ўсе хрысціянскія канфесіі [9]. З гэтага часу праводзіцца мэтанакіраваная ўніфікацыя справаводства, у тым ліку выкарыстанне рускай мовы ў ім. Акрамя таго, па штатах кансісторый 1842 г. прадугледжвалася 3–4 канцылярысты ў залежнасці ад разраду кансісторыі з дзяржаўным утрыманнем, і неабмежаваная колькасць за кошт саміх устаноў. Іх службовыя абавязкі былі размежаваны [2, арк. 13–16].

Пратакольная дакументацыя ўключае два віды дакументаў – журналы і пратаколы пасяджэнняў прысутнасці кансісторый, у якія ад моманту заснавання аз-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

начаных устаноў уносілася інфармацыя аб працэсе разгляду спраў. Журналы падзяляліся на паточныя і адмысловыя. Паточныя складаліся ў трох выпадках: калі справа патрабавала разгляду, таму што яе рашэнне магло быць неадназначным; пры распараджэнні грашовымі сумамі; пры фіксаванні дзейнасці кансісторыі ў дачыненні да прыватных асоб і розных устаноў, напрыклад, аб'яўленне прысуду. У адмысловыя журналы ўносіліся звесткі пра разгляд указаў імператара, Сената, прапаноў і прадпісанняў міністра ўнутраных спраў Расійскай імперыі і вышэйстаячых устаноў канфесіянальнага кіраўніцтва. Адначасова з журналамі па шэрагу пытанняў складаліся пратаколы. У гэтыя дакументы ўносіліся, распараджэнні адміністрацыйна-гаспадарчага характару, калі патрабавалася значнае фінансаванне; следчыя справы, якія не мелі адзінагалоснага рашэння. Таму, захоўванню пратакольнай дакументацыі надавалася асаблівая ўвага з боку канфесіянальнага кіраўніцтва, як, напрыклад, у Магілёўскай праваслаўнай кансісторыі [5, арк. 1 адв.], а парушэнні, напрыклад, адсутнасць адзнак аб выкананні рашэнняў, акцэнтаваліся падчас рэвізій дзейнасці ўстаноў [6, арк. 168–172].

Першапачаткова журналы і пратаколы складаліся ў рукапіснай форме, а з другой паловы XIX ст. асобнымі кансісторыямі, напрыклад Мінскай рымска-каталіцкай, выкарыстоўваўся друкаваны фармуляр. У праваслаўных кансісторыях у пачатку XX ст. запіс пачынаўся з другой трэці аркуша, а верхняя частка пакідалася для адзнакі аб зацвярджэнні або рэзалюцыі епіскапа [1, арк. 1 адв.; 7, арк. 4–4 адв.]. У кансісторыях інаслаўных веравызнанняў запіс пачынаўся ад верхняга полю аркуша. Журналы нумараваліся з пачатку кожнага справаводнага года валавым парадкам у левым верхнім вугле аркуша. Ніжэй пазначалася назва дакумента і дата пасяджэння. У пачатку XX ст. пратакаліраваліся таксама пасяджэні часовых камісій, як рэвізійнага камітэта магілёўскай епархіі [7].

Структура пратакольнай дакументацыі захоўвалася на працягу існавання ўстаноў: уводная частка (нумар, дата, дзень тыдня, назва дакумента), адзначэнне прысутных членаў кансісторыі, змест справы, подпісы сакратара і прысутных. Ва ўводнай частцы прапісвалася, кім вынесена на разгляд пэўнае пытанне і назва справы. Прысутныя занатоўваліся паводле пасад з іх пазначэннем і духоўнымі ступенямі. У афармленні журналаў, нягледзячы на агульныя падыходы, меліся ўласцівасці. Інструкцыяй дзейнасці рымска-каталіцкіх кансісторый замацоўвалася, што на левым полі журналаў насупраць зместу павінен стаяць нумар разглядаемай на дадзеным пасяджэнні справы, а на правым –адзнака аб яе выкананні: крыжык або кароткі запіс аб наступным этапе (прызначана інквізіцыя, напраўлены ліст і інш.) [3; 10, арк. 20 адв.]. У праваслаўных кансісторыях месца для адзнак часта адлінейвалася толькі з правага боку.

Асноўная частка журнальнага запісу дзялілася па схеме «Слухалі – Вырашылі». У першым раздзеле сцісла выкладаліся аргументы бакоў. Пры неабходнасці супрацоўнікамі адказнага за справу стала рыхтавалася даведка, якая таксама перапісвалася ў пратакол ці журнал або далучалася асобным дакументам да справы, як у праваслаўнай царкве. Фармулёўка рашэння ўключала доказы, завераныя подпісамі прысутных членаў кансісторыі, якія збіраліся перад пачаткам наступнага пасяджэння [4, арк. 802–807 адв.]. У выпадку адсутнасці пэўнага члена ў пратаколе адзначалася прычына.

У адрозненне ад журналаў пратаколы не мелі вызначанага тэрміну падпісання. У нарматыўных дакументах агаворвалася, што яны прадстаўляліся сакратаром на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

подпіс членам кансісторыі ў вызначаны для прысутных месц перыяд і падпісваліся на працягу трох дзён. Копіі (рабочыя варыянты і чарнавікі) журналаў і пратаколаў далучаліся да спраў, якіх тычыліся. У праваслаўнай і ўніяцкай цэрквах яны афармляліся на адвароце ўваходнага дакумента або асобным аркушы. У рымска-каталіцкай царкве іх занатоўвалі на правай палове асобнага аркуша. Арыгіналы перадаваліся на разгляд епіскапа, а пры неабходнасці ў праваслаўнай царкве па завяршэнні справаводства – у Сінод.

Такім чынам, у пратакаліраванні дзейнасці кансісторый хрысціянскіх цэркваў можна вылучыць два перыяды. З моманту стварэння кансісторый пачынаецца набліжэнне справаводства да агульнаімперскіх традыцый. Падчас выпрацоўкі дакументаў інструктыўнага характару выкарыстоўваўся Генеральны рэгламент 1720 г. Дакументы ўнутранага справаводства праваслаўнай царквы афармляліся на рускай мове, а рымска-каталіцкай – на польскай. Уніяцкая царква афармляла дакументы на абедзвюх мовах. З 1841 г. Статут духоўных кансісторый дазволіў распачаць працэс уніфікацыі справаводства. Пры гэтым дакументаванне дзейнасці рымска-каталіцкіх кансісторый пераводзіцца таксама на рускую мову. Выразных зменаў не адбылося ў структуры пратакольнай дакументацыі, да якой адносяцца журналы і пратаколы пасяджэнняў. Яна падзялялася на тры часткі: уступ з адзначэннем даты і прысутных членаў кансісторыі, асноўная частка па фармуліроўцы “Слухалі” – “Вырашылі” з даведкай, заключэнне з подпісамі прысутных. Копіі журналаў і пратаколаў далучаліся да спраў, якіх тычыліся. Пратакольная дакументацыя дазваляе праводзіць даследаванні ў галіне арганізацыі справаводства кансісторый і яго аб'ёму, дзейнасці ўстаноў і канфесій на грамадска-палітычнай арэне Расійскай імперыі.

**Літаратура**


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 4705.
2. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 16310.
3. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 22.
4. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 54.
5. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 1.
6. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 34.
7. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 140.
8. НГАБ. – Ф. 3245. Воп. 5. Спр. 8.
9. Устав духовных консисторий. – СПб. : Синод. тип., 1843. – 56 с.
10. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA). – F. 694. Ap. 1. B. 1687.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова